# 1945

# ДА НАШЫХ ДЗЁН

## У МІРНАЙ ПРАЦЫ

Не адразу раён траніў пад акупацыю, не адразу і вызваляўся. Спачатку 1 кастрычніка 1943 г. было закончана вызваленне яго левабярэжнай часткі. Потым нашы войскі спыніліся і пачалі рыхтавацца да прарыву ўтворанага на берагах Сожа і Проні абарончага рубяжа праціўніка.

А на вызваленай тэрыторыі ўжо пачалося адраджэнне. У в. Старынка ствараліся, галоўным чынам з былых партызан, мясцовыя кіруючыя органы. Выйшаў з падполля і пачаў легальна дзейнічаць Слаўгарадскі РК КП(б)Б на чале з яго сакратаром М.М.Нікіціным. Старшынёй райвыканкома стаў М.Я.Тарасенка, які прыбыў з Чырвонай Арміі. Пасля пераезду ў вызвалены Слаўгарад гэту пасаду заняў І.А.Сцефаненка. Аднак усе загадчыкі аддзелаў райвыканкома і кіраўнікі розных службаў былі прызначаны яшчэ ў Старынцы. Аднавілі дзейнасць сельсаветы, калгасы, МТС.

Вельмі цяжка было з кадрамі, паколькі амаль усё працаздольнае мужчынскае насельніцтва знаходзілася ў арміі. Тыя, хто заставаўся дома, прызываліся ў яе рады. Раніцай 25 лістапада пераможны сцяг узвіўся і над Слаўгарадам, а яшчэ праз некалькі дзён раён быў поўнасцю вызвалены ад ворага. Але, на жаль, фронт адышоў недалёка, спыніўшыся на левабярэжжы Дняпра. Слаўгарад і вёскі правабярэжнай часткі раёна, як і ў час грамадзянскай вайны, яшчэ больш за паўгода знаходзіліся ў прыфрантавой паласе.

Жыхары раёна разам з аднаўленнем разбуранай вайной гаспадаркі аказвалі дапамогу Чырвонай Арміі. Толькі ў сакавіку 1944 г. яны адпрацавалі на будаўніцтве дарог і мастоў 1373 чалавека-дні. Нярэдка выступалі і ў ролі праваднікоў, разведчыкаў, лячылі хворых і параненых чырвонаармейцаў. Не заставаліся ў даўгу і вайскоўцы. Калі дазвалялі абставіны, яны дапамагалі людзям адрамантаваць хату, выкапаць зямлянку, дзяліліся з галоднымі салдацкім пайком. Гэта была не дапамога таму ці іншаму боку, а ўзаемадапамога ў агульнай барацьбе з ворагам, накіраваная на яго хутчэйшы разгром.

Восенню 1943 г. жыхарам раёна трэба было клапаціцца аб тым, як пераджыць першую пасля вызвалення зіму, чым пракарміцца, як і чым яны будуць сеяць, калі прыйдзе вясна, і хто гэта будзе рабіць. Былі спалены і разбураны многія вёскі. У Бярозаўцы з 141 хаты знішчана 136, у Гіжэнцы з 112 — 102, у Дубне засталіся толькі 3 хаты з 58, у Клінах — 8 з 47, у Ходараве быў 71 двор, уцалелі толькі 2. Моцна

пацярпелі Рудня, Гайшын, Барсукоўка, Папоўка, Лебядзёўка, Людкоў, Прыволле, Ржаўка, Кулікоўка і іншыя вёскі. Жудасна выглядаў спалены і амаль дашчэнту разбураны Слаўгарад. Калі сюды вярнулася раённае кіраўніцтва, то размясцілася яно з вялікімі цяжкасцямі ў паўразбураным будынку былога райкома партыі. Супрацоўнікі райвыканкома ўладкаваліся ў невялічкім памяшканні былога нарсуда, што стаяў над Проняй у гарадскім парку. Тут за адным сталом размяшчаліся па 2—3 аддзелы.

Вайна, рэха якой чулася ў нашых вёсках ледзь не кожны дзень, патрабавала і ад фронту, і ад тылу велізарных намаганняў. А сродкаў і працоўных рук не хапала. Калі па перапісе 1939 г. у раёне налічвалася 39 973 чалавекі, у тым ліку 18 871 мужчына і 21 101 жанчына, то пасля вызвалення засталося толькі 25 139 чалавек, з іх мужчын — 8190. За час акупацыі было знішчана 11 157 галоў буйной рагатай жывёлы, 4724 кані, 12 146 свіней, 11 353 авечкі; спалена 2953 жылыя дамы, 58 школ, 5 медпунктаў, 23 клубы. Толькі ў пачатку акупацыі гітлераўцы расстралялі і павесілі 324 чалавекі, а ўсяго за вайну ад рук акупантаў і паліцаяў загінулі 4254 жыхары раёна, 1242 вывезены на катаргу ў Германію (лічбы дадзены ў даваенных межах раёна). Былі знішчаны амаль усе калгасныя пабудовы, сельскагаспадарчы інвентар, тэхніка. 61 авечка, 87 свіней, 15 коней ды па 1—2 каровы на вёску — вось што засталося ў раёне пасля яго вызвалення.

Каб выжыць у гэтых умовах, хутчэй аднавіць разбураную вайной гаспадарку, заставалася толькі адно — працаваць як мага больш і самаадданей. І гэта добра разумелі ўсе без выключэння: ад франтавікоў-інвалідаў, якія ўжо вярнуліся ў вёскі без рук ці без ног, да старых, жанчын і падлеткаў. І яны працавалі ад цямна да цямна, недасыпалі, недаядалі і часцей за ўсё не атрымлівалі ніякай платы за сваю цяжкую працу.

Праз 35 дзён пасля вызвалення Слаўгарада пачаў дзейнічаць прамкамбінат, наладзілася і хутка нарошчвалася вытворчасць цэглы. Шпарка ішло аднаўленне вапнавага завода ў в. Дубна.

Далі першую прадукцыю швейная і шавецкая арцелі. У снежні 1943 г. у райцэнтры запрацаваў паравы млын, крыху пазней вадзяны ў в. Харанеў. Аднавіла работу слясарная майстэрня.

На знявечанай зямлі аднаўляліся не толькі прамысловасць і сельская гаспадарка. Рабілася ўсё магчымае, каб зменшыць пакуты людзей. У пачатку 1944 г. былі створаны Слаўгарадскае, Лапаціцкае, Ржаўскае, Целяшоўскае і Чарнякоўскае спажывецкія таварыствы. 15 магазінаў і 2 сталовыя, амбулаторыя, 7 фельчарска-акушэрскіх пунктаў, 10 паштовых аддзяленняў і іншыя ўстановы абслугоўвалі насельніцтва. Адкрываліся школы.

З вялікай заклапочанасцю жыхары раёна чакалі першую пасля вызвалення вясну. Хуткімі тэмпамі пачалося аднаўленне ўсіх 75 калгасаў. Браўся на ўлік увесь сельскагаспадарчы інвентар. Як паведамляў у абком партыі М.М.Нікіцін, раён меў у наяўнасці 986 фурманак, 348 саней, 2039 плугоў, 1727 барон, 29 культыватараў, 2 малатарні, 3 зернеачышчальныя машыны. У Слаўгарадскай МТС былі адрамантаваны 2 трактары і 4 трактарныя плугі. Горш было з насеннем: збожжавых засыпалі 19,6%, тэхнічных культур — 20,8%, а бульбы — усяго 9,8% ад неабходнай колькасці. Але людзі не губляліся, настойліва шукалі выйсце, адрывалі апошняе ад сябе і аддавалі ў арцельную гаспадарку. Слаўгарадцам добра вядома імя Марыі Дзмітрыеўны Кажамякінай з в. Рабавічы. У той цяжкі час яна аддала калгасу ўсё сабранае для сваёй сям'і збожжа. І такіх прыкладаў было шмат.

Дзякуючы намаганням слаўгарадцаў і бескарыслівай дапамозе братніх

народаў краіны ўжо ў 1946 г. удалося правесці веснавую сяўбу. Калгасныя фермы налічвалі тысячы галоў буйной рагатай жывёлы, 1760 коней, 1682 авечкі. 3897 сямей справілі ўходзіны, у зямлянках засталося ўсяго 319 сем'яў. За паспяховае правядзенне веснавой сяўбы ў 1946 г. раён атрымаў пераходны Чырвоны сцяг і прэмію Савета Міністраў СССР.

Арганізаваная ў канцы 1948 г. раённая сельскагаспадарчая выстаўка падвяла вынікі плённай працы слаўгарадцаў за першыя пасляваенныя гады. Пасяўная плошча склала звыш 90% даваеннай, а калгасы «8 Сакавіка», «Чырвоны сцяг» Іванішчавіцкага сельсавета, «Баявік» гарадскога Савета і некаторыя іншыя засявалі ўжо больш, чым да вайны. На палетках працавалі 75 трактароў, дзесяткі аўтамашын, шмат іншай тэхнікі. Раён здаў дзяржаве ў 1,5 раза больш хлеба, чым у 1940 г. Вызначыліся і хлебаробскія лідэры: жывёлаводы Варвара Забеніна (калгас «Кастрычнік»), Еўдакія Мурачова (в. Рабавічы), трактарыст, былы франтавік Васіль Рыжанкоў, Зінаіда Марозава, абраная дэпутатам Вярхоўнага Савета БССР, і іншыя. Калгас «Пуцілавец» Лапаціцкага сельсавета аднавіў сваю ГЭС, якая дала вяскоўцам святло.

Станавіліся на ногі, мацнелі калектыўныя гаспадаркі. Пачалася масавая будоўля жылля, калгасных фермаў, іншых грамадскіх пабудоў. Дзяржава бясплатна адпускала лес і выдавала пазыкі на будаўніцтва дамоў. Правам на іх атрыманне ў першую чаргу карысталіся ўдзельнікі Вялікай Айчыннай вайны і сем'і загінуўшых. З папялішчаў узняліся вёскі Гіжэнка, Любаны, Рабавічы, Улукі, Чырвоная Слабада. У Слаўгарадзе былі здадзены ў эксплуатацыю 2 шматкватэрныя дамы для гараджан і новы кінатэатр «Радзіма» на 200 месцаў, іншыя будынкі. У 1954 г. уступіў у строй агароднінасушыльны завод.

Рабочыя прамысловых прадпрыемстваў перавыконвалі планавыя заданні. У 1955 г. арцель «Савецкая Беларусь» выпусціла звыш плана прадукцыі на 75 тыс. руб. Значных поспехаў дамогся і калектыў арцелі «Слава», утворанай на базе ранейшага цагельнага завода. Калі раней завод даваў у год 40 тыс. штук цэглы, то ў 1955 г. яе было выраблена каля 2 млн. штук.

Хуткімі тэмпамі развіваліся асвета, ахова здароўя, культура. У 68 школах, у тым ліку ў 2 сярэдніх (Слаўгарадскай і Васькавіцкай), навучалася 7613 вучняў. Педагагічны калектыў налічваў 310 настаўнікаў, 2/3 з іх мелі закончаную вышэйшую і сярэднюю адукацыю. Медыцынскія паслугі насельніцтву аказвалі бальніца на 100 ложкаў, дзіцячая кансультацыя, санэпідэмстанцыя, 4 урачэбныя ўчасткі. Працавалі кінатэатр, 3 кінаперасоўкі, раённая бібліятэка і 13 хат-чытальняў з агульнай колькасцю кніг каля 15 тыс. экзэмпляраў. Раённая радыёсетка налічвала 450 кропак.

У 1950 г. працаўнікі сельскай гаспадаркі амаль дасягнулі даваеннай пасяўной плошчы. Пачалося ўзбуйненне гаспадарак, якіх у 1955 г. стала толькі 22. З году ў год павялічвалася ўраджайнасць. У 1956 г. калгасы раёна здалі дзяржаве хлеба на 5250 ц больш, чым у 1954 г., і поўнасцю забяспечылі сябе насеннем. Нядрэнную плату атрымалі і самі хлебаробы. У перадавых гаспадарках імя М.Горкага, «XVII партз'езд», «Чырвоны партызан» на кожны працадзень было выдадзена больш за 1 кг збожжа.

У 1955 г. гаспадаркі раёна датэрмінова выканалі планавыя заданні па продажы дзяржаве малака і мяса, а калгас імя С.М.Будзённага да 10 снежня прадаў 20 тыс. кг малака і 4,5 т мяса ў лік будучага года. Яшчэ большых поспехаў дасягнулі жывёлаводы ў наступным годзе. Трывалае лідэрства ў гэтай галіне належала калгасам імя Л.М.Кагановіча, «Кастрычнік», «Памяці Фрунзе», імя М.Горкага, «Абарона



Будынак ПТВ № 219 у Слаўгарадзе.

краіны» і «Чырвоны партызан». Першы з іх на 100 га угоддзяў меў 21 галаву буйной рагатай жывёлы, у той час як у гаспадарках «Новы шлях», імя Я.М.Свярдлова гэты паказчык быў у 2—3 разы ніжэй.

Трэці раённы з'езд калгаснікаў, які адбыўся 30 снежня 1957 г., адзначыў, што ў параўнанні з 1954 г. грашовы прыбытак калгасаў раёна (з улікам гаспадарак далучанага ў чэрвені 1957 г. да нашага раёна Ракцянскага сельсавета) склаў 5 070 200 руб. У асобных калгасах ён павялічыўся ў 3—4 разы. У 1955 г. надой малака 1370 кг на 1 карову лічыўся рэкордам, а ў 1957 г. 1385 кг стала сярэдняй лічбай па раёне.

Ад пяцігодкі да пяцігодкі змяняўся воблік Слаўгарадчыны і яе жыхароў. Прыгажэў, узнімаўся ў вышыню сам райцэнтр. Тут у сакавіку 1965 г. уступіў у строй завод жалезабетонных вырабаў, першапачатковая магутнасць якога склала 8 тыс. $м^3$ зборнага жалезабетону, канечная — у 4 разы больш. Распачалося будаўніцтва масласырзавода, разлічанага на перапрацоўку 50 т малака за змену. 28 лістапада 1968 г. ён вырабіў першую прадукцыю.

З мэтай падрыхтоўкі кваліфікаваных спецыялістаў у ліпені 1978 г. у Слаўгарадзе адкрылася ПТВ № 219. На 1-ы курс было залічана 210 юнакоў і дзяўчат.

У 1983 г. раён адзначыў 40-годдзе вызвалення ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў. Непазнавальнай убачылі ветэраны і госці Слаўгарадчыну, на палях якой яны адважна змагаліся з ворагам. На месцах былых баёў узвышаліся карпусы прамысловых прадпрыемстваў, калгасныя пабудовы, фермы з механізацыяй усіх вытворчых працэсаў, а на машынных дварах кал-



Рабочыя Слаўгарадскага завода жалезабетонных вырабаў.



Да пяці тысяч тон сыру вырабляюць за сезон на Слаўгарадскім масласырзаводзе. Прадукцыя завода паступае не толькі на беларускі рынак, але і ў Расію. На здымку: у сырасховішчы завода.

гасаў і саўгасаў меліся дзесяткі трактароў, камбайнаў, аўтамабіляў. Ужо працаваў свінагадоўчы комплекс «Свенск» на 12 тыс. галоў. Будаваліся кормапрадпрыемства «Сож», новыя дарогі, іншыя народнагаспадарчыя аб'екты. У 11-й пяцігодцы ўкладанні раёна толькі па калгасах і саўгасах склалі каля 23,5 млн. руб. Было ўведзена ў эксплуатацыю 15 326 м$^2$ жылля, у тым ліку на вёсцы 9882 м$^2$, 11,2 км водаправода, на 29 тыс. т сянажных і сіласных збудаванняў, на 4,4 тыс. т павецей для сена, шмат іншых аб'ектаў.

Усё гэта было дасягнута шматгадовай плённай працай тысяч жыхароў раёна, якія многа зрабілі, каб квітнеў і прыгажэў адзін з маляўнічых куткоў Прысожжа. І зрабілі б значна больш, калі б не Чарнобыльская катастрофа ў 1986 г. Чорным крылом яна прайшлася па Слаўгарадчыне, шмат пакут прынесла людзям. І зноў, як у пасляваенны час, жыхары раёна мужна змагаюцца з напаткаўшай іх бядой, не менш страшнай, чым мінулая вайна.

Ад яе і наступствы аказаліся больш цяжкія, як матэрыяльныя, так і маральныя. Адна за другой знікаюць з карты раёна вёскі, а ў тых, што яшчэ існуюць, усё менш застаецца жыхароў. За пасляаварыйны перыяд насельніцтва раёна скарацілася на 6,2 тыс. чалавек і складае зараз 17,5 тыс., што амаль удвая менш, чым было ў 1959 г. (33,5 тыс.). Больш як у два разы зменшылася колькасць працаздольных на вёсцы. У 1998 г. іх налічвалася ўсяго 2,6 тыс. чалавек.

Катастрафічнай застаецца ў раёне кадравая праблема, і ў першую чаргу ў медыцыне. У 1998 г. на 64 урачэбныя



МПМК № 274 узводзіць новыя дамы ў райцэнтры.

стаўкі было толькі 27 урачоў — 42 працэнты ад патрэбы. А ўрачэбная дапамога неабходна кожным двум слаўгарадчанам з трох.

Чакаць, што гэта статыстыка зменіцца ў бліжэйшы час у лепшы бок, дарэмна. У тым пераконваюць дзве акалічнасці — павелічэнне смяротнасці і зніжэнне нараджальнасці.

Тым не менш жыццё працягваецца. Як і паўсюдна, людзі хочуць, каб яно было лепшым. І мясцовае кіраўніцтва разам з насельніцтвам робіць усё магчымае дзеля гэтага.

Толькі пасля 1986 г. у раёне заасфальтавана 140 км дарог агульнага і ўнутрыгаспадарчага прызначэння, пракладзена 137,6 км водаправодаў, добраўпарадкавана каля 50 км гарадскіх і сельскіх вуліц. Працягваецца газіфікацыя раёна — пракладзена 23,6 км трубаправода, што дазволіла перавесці на прыродны газ 4 кацельні.

Пабудавана 5 школ, 2 клубы, 3 фізкультурна-аздараўленчыя ўстановы, 640 квартэр агульнай плошчай 41 323 м². За кожнай з гэтых лічбаў — напружаная праца соцень і тысяч слаўгарадчан. Працавітых, руплівых, такіх, як тройчы кавалер ордэнаў Леніна, Кастрычніцкай Рэвалюцыі, «Знак Пашаны» І.І.Зарэцкі з саўгаса «Жалезінскі», кавалер ордэнаў Леніна і Працоўнага Чырвонага Сцяга Ф.П.Кавалёў, які шмат гадоў узначальваў комплексную брыгаду ў в. Дуброўка; паляводы І.Ц.Сідарэнка, А.К.Маслаў, М.Н.Мельнікаў, М.П.Кухараў, П.І.Каленчанка, жывёлаводы Н.І.Янчанка, Г.І.Астапцова; К.Ф.Марчанка, які з 1964 г. узначальвае хірургічнае аддзяленне раённай бальніцы і на рахунку якога сотні выратаваных жыццяў, і інш.

Усе гэтыя людзі ў жыцці, у працы бралі прыклад з тых, хто самааддана змагаўся з ворагам, а потым уздымаў з руін і попелу народную гаспадарку Слаўгарадчыны. Іншыя з іх былі бязрукія ці безногія, як П.Б.Аляксеенка, Ф.Ц.Лосеў, але працавалі па-франтавому. Тыя, хто вярнуўся з вайны цэлым і здаровым, лічылі сваім абавязкам падстаўляць сваё плячо там, дзе найбольш цяжка. Усіх іх немагчыма пералічыць у адным артыкуле. Але ж хоць некаторых назваць трэба. Гэта І.Ф.Сцепанцоў, А.І.Латушкін, Н.В.Лапуцін, І.І.Смалячкоў, С.Р.Хрубераў і шмат іншых.

Лёсу гэтага пакалення не пазайзд-



Ф.Ц.Лосеў.



А.І.Латушкін.



Н.В.Лапуцін.



І.І.Смалячкоў.



К.Ф.Марчанка.

росціш. Праз колькі выпрабаванняў яму давялося прайсці! Апошняе з іх — сацыяльна-эканамічны крызіс канца 1980 — 1990-х гадоў. Аднак ёсць спадзяванні, што, хаця і вельмі маруднa, ён адыходзіць у мінулае.

Нягледзячы на неспрыяльныя ўмовы 1998 г. слаўгарадчане выйшлі пераможцамі ў рэспубліканскім спаборніцтве па ўборцы зерневых і зернебабовых культур. За гэта раён атрымаў Ганаровы дыплом і грашовую прэмію ў памеры 150 млн. руб. і легкавы аўтамабіль для службовага карыстання. Ганаровым дыпломам і прэміяй у памеры 80 млн. руб. адзначаны і калгас «Зарэчанскі». А старшыня райвыканкома В.В.Берастаў і старшыня калгаса А.М.Самусёў асабіста адзначаны наручнымі гадзіннікамі.

Па гэтых гадзінніках будуць вывярацца крокі раёна наперад. Няхай жа шлях будзе добрым.

*П.С.Ерашэнка, В.А.Новікаў.*

## Подзвіг даўжынёй у два гады

Калі летам 1941 г. навісла пагроза акупацыі нямецка-фашысцкімі захопнікамі в. Дуброўка, Фядора Кузьмінічна Дудзянкова прыгнала калгасны статак кароў у глыбокі тыл. Там яна два гады даглядала і зберагала жывёлу, а пасля вызвалення Слаўгарадчыны ад гітлераўцаў вярнулася ў родную вёску разам з калгасным статкам. Гэта быў сапраўдны працоўны подзвіг — подзвіг даўжынёй у два гады.

## На будаўніцтва экскадрыллі самалётаў

1 красавіка 1944 г. у «Советской Белоруссии» і іншых газетах рэспублікі была змешчана вось такая інфармацыя:

«Журавичи, 30 марта (БЕЛТА). Колхозники района внесли на строительство экскадрильи самолетов 269 тыс. рублей. В ряде колхозов в фонд строительства самолетов вносятся зерно и другие продукты.

Колхозники сельхозартели «Первый ударный» внесли 166 центнеров зерна».

«Першым ударным» называўся калгас у маёй роднай вёсцы Бахань, якая потым увайшла ў склад Слаўгарадскага раёна. Гэта зерне не было лішнім у маіх землякоў. Але яны вырашылі: лепш будуць есці аладкі з мёрзлай бульбы, толькі няхай Чырвоная Армія хутчэй дабівае ненавіснага ворага.

*К.Е.Жукаў.*

## Франтавыя брыгады

6 красавіка 1944 г. у Слаўгарадзе адбыўся раённы партыйны сход. Яшчэ з фронту даносіліся гукі артылерыйскай кананады, яшчэ на палях валялася пакарабачаная баявая тэхніка, а камуністы раёна ўжо абмяркоўвалі пытанне падрыхтоўкі і правядзення веснавой сяўбы. Усяго ў сходзе ўдзельнічала 39 членаў і кандыдатаў у члены партыі, 13 з якіх выступілі ў спрэчках.

Да пачатку веснавых палявых работ у МТС меліся 24 трактары. У насенны фонд было засыпана па раёне 2121 ц збожжавых і 102,9 ц тэхнічных культур, што складала ўсяго 20% ад неабходнай колькасці. Яшчэ горш было з бульбай. Яе засыпана было ўсяго 2144 ц — 9,8% ад патрэбнага насеннага фонду.

Аднак, нягледзячы на такое становішча, гаспадаркі пачалі актыўна рыхтавацца да веснавой сяўбы. Так, у калгасе «Пралетарый», дзе старшынёй тады працаваў тав. Пусянкоў, быў поўнасцю адрамантаваны ўвесь сельскагаспадарчы інвентар, ачышчана насенне, створана 5 брыгад і 20 звеняў.

Да пачатку вясны 1944 г. у аднаўленых калгасах раёна было створана 189 брыгад і 281 звяно, на рамонце сельскагаспадарчага інвентару працавала 15 кавалёў.

У сакавіку праведзены 10-дзённы семінар старшынь і брыгадзіраў калгасаў,